


АСОБА

У Гродне прызначылі новага пракурора горада. Што здарылася са старым?

3 КРАСАВІКА 2023, 16:26

Анатоль Іванюк стаў новым пракурорам Гродна. Раней ён быў намеснікам пракурора Гродзенскай вобласці. Былы ж пракурор горада Уладзімір Клішын заняў месца Іванюка. Фактычна, пракуроры памяняліся месцамі. Пра ратацыю паведаміў «Гродна плюс».



Анатоль Іванюк. Крыніца: grodnonews.by

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года Анатоль Іванюк выказваўся пра пратэсты і тое, што грамадства «накальваюць звонку, мэтанакіравана распальваючы супрацьстаянне і канфлікты на глебе палітычных поглядаў».

Чым запомніўся Клішын на сваёй пасадзе

Уладзімір Клішын

- 53 гады,
- Нарадзіўся ў Гродне.
- Скончыў юрыдычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. Янкі Купалы ў 1995 годзе па спецыяльнасці «правазнаўства».
- У маладосці гуляў у футбол з журналістамі незалежных СМІ, грамадскімі дзеячамі і апазіцыянерамі.
- На пасаду пракурора горада ўступіў у 2013 годзе пасля аб’яднання пракуратур Ленінскага і Кастрычніцкага раёнаў у чыне старэйшага дарадцы

юстыцыі. Да таго ўзначальваў пракуратуру Кастрычніцкага раёна. Працу ў пракуратуры пачынаў як стажор памочніка пракурора Ленінскага раёна.

- З 2014 года Клішын — член Гродзенскага гарадскога савета дэпутатаў ад Дамброўскай выбарчай акругі (№ 8).
- Пракурора Гродна Уладзіміра Клішына ўзнагародзілі ордэнам Пашаны. Адпаведны ўказ падпісаў Лукашэнка 15 лютага 2022 года. Клішын атрымаў узнагароду «за асаблівыя заслугі ва ўмацаванні дзяржаўнай бяспекі і барацьбе са злачыннасцю, плённую дзяржаўную і грамадскую дзейнасць».



Уладзімір Клішын. Скрыншот з «Гродна Плюс»

Уладзімір Клішын і рэпрэсіі

Пасля выбараў 2020 года Уладзімір Клішын быў адным з тых, хто кіраваў рэпрэсіямі ў горадзе. У жніўні 2020 года ён сустракаўся з работнікамі «Гроднажылбуда», выступаў перад калектывам «Хімвалакно».

Па заявах Уладзіміра Клішына былі прызнаныя экстрэмісцкімі шэраг гродзенскіх Telegram-каналаў, у тым ліку былы канал **Hrodna.life**. Таксама Клішын выступаў заяўнікам па ліквідацыі праз суд грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў. Па пазове Уладзіміра Клішына суд прыняў рашэнне аб ліквідацыі «Цэнтра гарадскога жыцця» і ТАА «Гродна Лайф медыя».

У ліпені 2021 года пракурор выдаў афіцыйнае папярэджанне галоўнаму рэдактару **Hrodna.life** Аляксею Шоце аб адказнасці за парушэнне артыкула 23.5, 198-1 і 361 КаАП і артыкула 361-4 Крымінальнага кодэкса (парушэнне закона аб СМІ, заклікі да дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Беларусі і садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці).

Выступаў у ролі дзяржабвінаваўцы на працэсах па справах прызнанага палітвязнем Канстанціна паляка і Дзмітрыя Зімніцкага, абскарджанні прысуду Вадзіму Плаўскаму.

Уладзімір Клішын выклікаў рэдактара сайта Znadniemna.pl журналіста Анджэя Пісальніка на размову, а на наступны дзень яго з жонкай прымусова завезлі ў Менск на допыт у Следчы камітэт.

Уладзімір Клішын лічыць, што відэаназіранне — самы эфектыўны спосаб выявіць хуліганства на гарадскіх вуліцах.

Падабаецца Hrodna.life? Падтрымай нас! Хутка, без рэгістрацыі і падпісак

БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯ 2020-ГА | ЗАКОН | ПАЛІТЫКА

0

РАІМ ПАЧЫТАЦЬ

Азотаўцы-экстрэмісты, штрафы экскурсаводам, затрыманне ксяндза. Як прайшоў тыдзень у Гродне і вобласці

Для Паўла Мажэйкі і Юліі Юргілевіч запатрабавалі па шэсць гадоў пазбаўлення волі

Жыхара Ваўкавыска затрымалі за абразу расійскіх вайскоўцаў

АПОШНІЯ ЗАПІСЫ

У Гродне закрылі кафэ з творамі мастацтва. Аўтараў просяць забраць свае працы

29 ЖНІЎНЯ 2023, 17:06

«Адкаціліся на 30 гадоў назад». Што здарылася з польскамоўнай адукацыяй на Гродзеншчыне?


29 ЖНІЎНЯ 2023, 17:06

Польскія панкі сабралі грошы на дапамогу мігрантам, якія штурмуюць мяжу з ЕС

29 ЖНІЎНЯ 2023, 14:24

Шоўрум дзіцячай мэблі з масіва адкрылі ў Гродне

29 ЖНІЎНЯ 2023, 13:49



FACEBOOK / INSTAGRAM / TELEGRAM / RSS / YOUTUBE / ВКОНТАКТЕ

2016-2023 Выкарыстанне матэрыялаў сайта дазваляецца паводле правілаў ліцэнзіі Creative Commons BY-SA 4.0 Int са спасылкай на крыніцу і ўказаннем аўтара. Падрабязныя правілы перадруку тут .